**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр. Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БІК: AKBB BY 2X; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «ААБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр. Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БИК: AKBB BY 2X; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

06.04.2023 № 01-17/К-132

На № ______________ ад ________________

Кавалкін В.А.
вул. Янкі Мавра, 52-11
г. Мінск 220125

(для інфармавання
зацікаўленых)

Аб разглядзе зварота

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Міністэрства культуры, разглядзеўшы Ваш калектыўны зварот, які паступіў 16 сакавіка 2023 г., па пытанні стварэння філіяла установы «Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быта» на базе вуліц г. Магілёва, паведамляе наступнае.

Супрацоўнікамі ўстановы культуры «Музей гісторыі Магілёва» быў праведзены візуальны агляд драўляных будынкаў канца XIX – сярэдзіны XX стагоддзя, якія захаваліся ў г. Магілёве.

Па выніках агляду ўстаноўлена наступнае: вул. Лазарэнкі, 31 – дом не існуе; вул. Струшня, 12 – дом адноўлены, дэкор страчаны; вул. Струшня, 27 – дом моцна абгарэў, дэкор не захаваўся; вул. Струшня, 45 – захаванасць здавальняючая, дом жылы, з аднаго боку мае прыбудову, дэкор часткова зняты; вул. Свярдлова, 11, 24 – захаванасць здавальняючая, дамы жылыя, дэкор захаваўся, патрабуе кансервацыі; вул. Вароўскага, 27 – захаванасць дэкора здавальняючая, дом жылы, маюцца прыбудовы; вул. Яцыны, 8, 12, 13 – захаванасць здавальняючая, дамы жылыя, дэкор захаваўся; вул. Быхаўская, 22 – дом жылы, дэкор захаваўся; вул. Пляханава, 27 – па гэтаму адрасу знаходзіцца машынабудаўнічы каледж, вул. Чалюскінцаў, 56 – захаванасць здавальняючая, дом жылы; вул. Севастопальская, 10 – захаванасць здавальняючая, дом жылы, дэкор захаваўся; зав. Ленінградскі, 7 – захаванасць здавальняючая, дом жылы, дэкор захаваўся; вул. Садовая, 25 – захаванасць здавальняючая, дом жылы, дэкор

захаваўся; вул. Чэхава, 30, 32 – захаванасць здавальняючая, дом жылы, дэкор захаваўся.

У рамках разгляду пытання аб мэтазгоднасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'ектам драўлянага жылога будаўніцтва, установе культуры «Музей гісторыі Магілёва» даручана падрабязнае вывучэнне дадзенай тэмы.

Разам з тым стварэнне філіяла ўстановы «Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту» (далей – музей) на базе вуліц г. Магілёва з'яўлецца не мэтазгодным. Так як згодна карэктыроўкі генеральнага плана тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо Мінскага раёна) і разпрацоўкі дэтальнага плана з эскізам застройкі тэррыторыі музея, зацверджанай рашэннем Мінскага раённага выканаўчага камітэта ад 12 студзеня 2015 г. № 115, тэрыторыя музея прадстаўлена ў выглядзе экспазіцыйных зон гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў цэласнага градабудаўнічага ўтварэння – паселішча сельскага тыпу, у якім у максімальнай ступені адлюстроўваецца ўнікальнасць і сваеасаблівасць народнай культуры і побыту, а таксама экалагічнага багацця прыроднага асяроддзя паселішчаў розных рэгіёнаў Беларусі.

Жылыя дамы, па вышэйузгаданых вуліцах г. Магілёва ўяўляюць сабой прыклад гарадской культуры і побыту канца XIX – сярэдзіны XX стагоддзя г. Магілёва, размешчаны дысперсна, не ўтвараюць адзіны квартал, або вуліцу, з'яўляюцца жылымі на правах прыватнай уласнасці, часта ў долях з саўладальнікамі.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» вынік разгляду можа быць абскарджаны ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Першы намеснік Міністра В.І. Грамада

05 Авдей 203 71 76 (139@kultura.gov.by)